# Зімовыя таўкачыкі

На пачатку лютага ў Белдзяржфілармоніі фалькларыст, лідар і саліст фольк-рок-шоў «Ur'ia» Юры Выдронак пры падтрымцы Міністэрства культуры ладзіў шосты фольк-мадэрн фэст «Таўкачыкі». Нагадаю, што першая імпрэза адбылася ў 2000 г. у тэатры эстрады БДУ культуры і мастацтваў; потым ён праходзіў у 2004, 2008 («Таўкачыкі на Каляды», «Таўкачыкі на Юр'я») і 2009 («Таўкачыкі на Дзяды» на сцэне Купалаўскага тэатра) гадах. Мэта праекта – далучэнне моладзі да беларускага фальклору і прапаганда нацыянальнага фольк-мадэрну.

Сёлетнюю тэматыку канцэрту задало фольк-рок-шоў «Ur'ia», што прадставіла «Шчодры вечар» у сучаснай апрацоўцы. Потым былі вясельныя песні ў выкананні гурта вёскі Ольніца Глускага раёна, калядны карагод з казой выканаў дзіцячы фальклорны калектыў САШ № 3 г. Мінска «Гарлачыкі», прагучалі аўтэнтычныя песні ў выкананні этнаграфічных гуртоў з вёсак Обчын, Ямінск, Закальное і Рачэнь Любанскага раёна. Упершыню ў Мінску на вялікай сцэне этнаграфічны гурт вёскі Дубрава Глускага раёна паказаў абрадавыя сцэнкі з тэатралізаваных абрадаў «Ваджэнне казы» і «Ваджэнне мядзведзя». Майстэрскае валоданне народнымі інструментамі прадэманстравалі музыкі фальклорных калектываў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў «Талака» і «Ветах». Фальклорны калектыў «Мотальскія суседзі» пад кіраўніцтвам Эльвіры Каткавец прапанаваў калядны спектакль. Удзельніца гурта «Ur'ia» малады дызайнер касцюма Вольга Рыжкова прэзентавала зробленую ёю паводле фотаздымка з альбома М. Раманюка рэканструкцыю Давід-Гарадоцкага жаночага строю XVIII–XIX стст.

У праграме знайшлося месца і фольк-мадэрну – гралі і спявалі фольк-рок-гурт «ALTANKA», гомельскі гурт «Бан Жвірба»; выступілі таксама індыйскія танцоркі групы «Індывара» і госць з Швецыі – знаўца народных інструментаў і фальклору спявачка Sofia Juliusdotter, у рэпертуары якой больш за 400 народных песень. Яна вельмі ўразіла гледачоў дыяпазонам свайго голасу.

Фэст завяршыўся традыцыйным выкананнем усімі ўдзельнікамі разам з гледачамі гімна «Таўкачыкаў».

Мне пашанцавала пагутарыць са спявачкамі этнаграфічнага гурта «Шчодрык» з вёскі Рачэнь. Калектыў існуе амаль сорак гадоў, кіруе ім Аляксандр Кукраш. Удзельніцы, якіх добра ведаюць не толькі ў Любанскім раёне, спяваюць народныя песні ўсё жыццё. Калісьці ў іх калектыве было амаль паўтара дзесятка жанчынаў. Старэйшай спявачцы 84 гады, самай «маладой» – 60. У рэпертуары калектыву выключна аўтэнтычныя старадаўнія спевы. Найбольш старадаўняя – «Ой пойду, пойду ў лясок...». Жанчыны заначылі, што песні іх нідзе не запісаныя, а захоўваюцца выключна носьбітамі.

Пры ўсёй павазе да збіральніка і прапагандыста фальклору Ю. Выдронка нельга не выказаць заўвагі.

Лічу, што модныя эксперыменты па спалучэнні жывой аўтэнтыкі з сучаснай электроннай музыкай выглядалі здзекам з захавальніцаў спеваў Ольніцы, якія выступалі пад грукат і ляскание цяжкага року. Да носьбітаў аўтэнтычнага фальклору трэба ставіцца з вялікай павагай і вельмі асцярожна. Аднак трэба адзначыць, што сапраўдныя спевы не згубіліся ў тым грукаце – тры 75-гадовыя спявачкі выглядалі вельмі годна. Сучасным спевакам варта павучыцца дыкцыі ў паважаных бабулек, якіх добра чуваць і без мікрафонаў ды шматлікіх электронных прыладаў. Немалаважны і знешні выгляд выканаўцы. Трэба заўважыць, што наогул нельга з фальклору рабіць шоў, бо кожны аўтэнтычны спеў нясе сімволіку духоўнай культуры народа, асаблівасці светаўспрымання прыродных з'яваў і выконваецца ў адпаведную пару года і пры адпаведных жыццёвых абставінах. Таму вельмі недарэчна выглядаюць на салідных канцэртах вясновыя песні восеньскай парой ці калядныя ўлетку. А ў праекце фалькларыста такое дараваць і ўвогуле нельга: не варта гурту «Ur'ia» гукаць вясну 2 лютага...

Але ў цэлым усё атрымалася добра. Ідэя «Таўкачыкаў» дзеля папулярызацыі сярод моладзі роднай мовы і скарбаў беларускага фальклору заслугоўвае павагі і ўсебаковай падтрымкі. Трэба падзякаваць Юрыю Выдронку за такую вельмі важную справу і пажадаць далейшай працы над удасканаленнем гэтага праекта.



Спявачкі з в. Ольніца

***Кав. ЦВІК,***
***фота аўтара***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ